**Граза** душманскіх караванаў // Голас Сенненшчыны. — 2006. — 14 лют. — С. 2.

# ГРАЗА ДУШМАНСКІХ КАРАВАНАЎ

**З дасье**

**Генерал-лейтэнант запасу Дзмітрый Міхайлавіч Герасімаў нарадзіўся ў 1948 годзе ў в. Варашылы Сенненскага раёна ў рабочай сям'і, якая складалася з васьмі чалавек. Жылі вельмі бедна, і таму з ранняга дзяцінства давялося ўключыцца ў працу. Пасля заканчэння СШ № 2 г. п. Багушэўск паехаў у Расію, дзе працаваў праходчыкам на шахце ў Карагандзе. Тэрміновую служыў танкістам, затым закончыў Ташкенцкае вышэйшае танкавае каманднае вучылішча імя П. С. Рыбалкі. З 1988 года – у спецназе. Пасля заканчэння ваеннай акадэміі імя Фрунзе быў накіраваны камандзірам атрада спецназа ў Беларускую ваенную акругу. У 1983 годзе стаў камандзірам брыгады спецыяльнага назначэння ў Сярэднеазіяцкай ваеннай акрузе. Два з паловай гады ваяваў у Афганістане. Пасля заканчэння Акадэміі генеральнага штаба Узброеных Сіл РФ быў накіраваны ў галоўнае разведвальнае ўпраўленне, а затым у органы дзяржбяспекі. У ліпені 1999 года ў званні генерал-лейтэнанта звольнены ў запас. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, «За ваенныя заслугі», ордэнам ДРА «За храбрость», многімі медалямі. Двое сыноў Дзмітрыя Міхайлавіча таксама сталі ваеннымі: старшы сын Дзмітрый – маёр Расійскай арміі, малодшы Аляксандр – слухач акадэміі.**

**Д. М. Герасімаў цяпер жыве ў Маскве.**

...22-я брыгада спецыяльнага назначэння, якой камандаваў Д. М. Герасімаў з 1983 года, дыслацыравалася ў горадзе Капчагае. Ствараў яе практычна на голым месцы папярэднік Герасімава палкоўнік Груздзеў. Галоўнай задачай Дзмітрыя Міхайлавіча было прывесці ў парадак тэхніку, і ўжо праз год брыгада трывала ўстала на ногі. А ў хуткім часе ёй быў прадпісаны пункт дыслакацыі: правінцыя Гільменд, горад Лашкаргах. У яе склад уліваўся 3-і асобны мотастралковы батальён.

Пасля атрымання задання, як звычайна, пачалася падрыхтоўка тэхнікі, узбраення, асабістага саставу да баявых дзеянняў. Усё гэта праводзілася ў Капчагае пад Алма-Атой. І ў пачатку сакавіка 1985 года пачалася перакідка тэхнікі і асабістага саставу ў Кушку. А ў ноч з 14 на 15 сакавіка брыгада перайшла граніцу з Афганістанам.

З самага пачатку камандзір прыступіў да падрыхтоўкі асабовага саставу, вывучэння мясцовасці. Адначасова ўладкоўваўся і быт. Салдаты будавалі ў тым ліку і саманныя пабудовы з гліны з саломай. У брыгадзе служылі хлопцы з Сярэдняй Азіі, якія ведалі, як гэта робіцца. У якасці форм для цагліны выкарыстоўваліся скрыні з-пад боепрыпасаў. Замест цэменту выкарыстоўвалі пясок. У пустыні ён такі, што калі яго змяшаць з вадой, дык атрыманай сумессю можна нават тынкаваць сцены.

Адначасова ўзмоцнена займаліся падрыхтоўкай для ўдзелу ў баявых дзеяннях. У аператыўнае падпарадкаванне брыгадзе перадалі 208-ю асобную авіяцыйную эскадрыллю.

Першы баявы выхад адбыўся недзе ў канцы красавіка. Па паступіўшай інфармацыі ў раёне паўночней Гірышка знаходзілася школа па падрыхтоўцы гранатамётчыкаў. Бой атрымаўся жорсткім. Пры пераправе праз Арык была падбіта БМП (яе потым удалося выцягнуць), было

некалькі параненых. Але байцы брыгады нанеслі праціўніку значны ўрон, знішчыўшы, па дадзеным агентурнай разведкі, каля 80 душманаў. Школа фактычна перастала існаваць.

Увесь час брыгада вучылася ваяваць. Перад любым выхадам групы салдаты рабілі макеты мясцовасцей, на якіх адпрацоўвалі ўсемагчымыя эпізоды, варыянты ваенных дзеянняў разам з верталётчыкамі і іншымі прыдадзенымі падраздзяленнямі. Вывучалі вопыт разведкі мотастралковых падраздзяленняў.

Душманы таксама вялі супраць брыгады разведку. Яны нават ведалі радыус дзеянняў верталётаў, які ў той час складаў 120 км ад аэрадрома.

Каб збіць з толку душманскіх главароў, было прынята рашэнне аб высылцы ўзмоцненай бронегрупы ў пустыню на адлегласць 120 км ад пастаяннага месца дыслакацыі. Такім чынам удалося дасягнуць вельмі высокіх вынікаў. Былі знішчаны 4 склады боепрыпасаў на адкрытых пляцоўках душманаў, якія расстралялі за гэта 6 сваіх чалавек. Яны палічылі іх вінаватымі ў такіх буйных стратах.

Д. М. Герасімаў успамінае яшчэ адзін эпізод, калі былі ўзяты 14 тон опіуму-сырцу. Калі аглядавая група вылецела на агляд пустыні, верталётчыкі ўбачылі, што ідзе калона душманаў. Верталёты зрабілі заход, і варожыя машыны сталі раз’язджацца ў розныя бакі. Яны былі спынены агнём, з верталётаў высадзіліся аглядавыя групы. Аказалася, што ўсе 8 машын да ўпору загружаны опіумам-сырцом. Іх даставілі ў часць, а калі далажылі пра «знаходку» начальніку штаба 40-й арміі генерал-маёру Сяргееву, той нават не паверыў гэтаму. Але і сапраўды душманы везлі опіум, дарэчы, вельмі вялікай якасці. У рэшце рэшт наркотык быў спалены.

Аднойчы аглядавая група захапіла 2 мяшкі з грашыма. Як потым высветлілася, там было больш 2 млн. афгані, якія прызначаліся для разлікаў з душманамі. Але так не атрымалася – грошы перакінулі ў палявы банк у Кандагары.

Эпізодаў баявых дзеянняў можна прыводзіць шмат. Да таго часу брыгада мела сваю агентуру нават на тэрыторыі Пакістана. У прыватнасці, адзін белудж, якога матэрыяльна зацікавілі, вельмі паспяхова працаваў на брыгаду спецназа. Умова была такая: ён «здае» пяць караванаў і з апошняга лепшую машыну бярэ сабе. І ўсё, што ў ёй знаходзіцца, становіцца яго ўласнасцю, акрамя зброі і боепрыпасаў. З-за матэрыяльнай зацікаўленасці працавалі і многія іншыя агенты.

Асаблівыя меры прымаліся для захавання жыцця людзей. Перш чым узяць камандаванне на сябе, кожны афіцэр рабіў 5–6 выхадаў у складзе групы радавым. Спачатку навічкі хадзілі на невялікія адлегласці з такім разлікам, каб ім можна было аказаць дапамогу. За два з паловай гады, якія Д. М. Герасімаў правёў у Афганістане, у брыгадзе загінулі 47 чалавек і тыя, у асноўным, у самым пачатку – з-за неасцярожнага абыходжання са зброяй.

У 1987 годзе 22-я брыгада была прадстаўлена да ўзнагароджання ордэнам, але ёй быў уручаны толькі пераходны вымпел Міністэрства абароны СССР. Справа ў тым, што па палажэнню ордэн уручаўся толькі ў тым выпадку, калі часць існавала больш 15 гадоў. А брыгада не падышла «па ўзросце». У жніўні гэтага ж года на замену Герасімаву прыбыў падпалкоўнік Сапалаў. А Дзмітрый Міхайлавіч пасля Афгана закончыў Акадэмію генеральнага штаба і быў накіраваны ў ГРУ, затым пераведзены ў Міністэрства дзяржбяспекі Расіі. Камандаваў групай спецыяльнага назначэння «Вымпел». Узначальваў упраўленне спецыяльных аперацый, быў намеснікам кіраўніка дэпартамента па барацьбе з тэрарызмам і не раз успамінаў добрым словам школу армейскага спецназа, сваіх баявых сяброў.